Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!



# Беларускі універсітэт

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ЧАЦВЕР 20 СТУДЗЕНЯ 1977 г.

№ 3 (1153)

Цана 2 кап.

## ЗНАХОДКІ ВУЧОНЫХ—У ВЫТВОРЧАСЦЬ

У Справаздачным дакладзе XXV з'езду КПСС Л. І. Брэжнеў адзначыў, што «практычнае ўкараненне новых навуковых ідэй — гэта сёння не менш важная задача, чым іх распрацоўка». Калектыў навукова-даследчага аддзела БДУ добра разумее гэта і працуе над павышэннем якасці навуковых даследаванняў з мэтай хутчэйшага ўкаранення іх вынікаў у вытворчасць.

У мінулым годзе выкарыстанне ў народнай гаспадарцы 36 дагаворных навуковых распрацовак дало эканамічны эфект у 3265,2 тысячы рублёў. Эканамічны эфект толькі ад даследаванняў, выкананых на фізічным факультэце, склаў звыш 2 мільёнаў рублёў, ад распрацовак радыёфізічнага факультэта — каля 1 мільёна рублёў.

Як вядома, шырокі ўдзел у навуковых даследаваннях прымаюць студэнты. Адна з найбольш важных распрацовак выканана ў студэнцкай лабараторыі пад кіраўніцтвам старшага навуковага супрацоўніка У. Мікуловіча. Прымяненне зробленай студэнтамі прылады «Сочачы аналізатар вібрацыі» дае эканамічны эфект у 630 тысяч рублёў у год.

На кафедры агульнага праграміравання распрацоўваюцца аўтаматычныя сістэмы кіравання прадпрыемствамі прамысловасці.

Распрацаваныя ў БДУ АСК працуюць на Мінскім трактарным і Таганрогскім камбайнавым заводах, на Пінскім камбінаце верхняга трыкатажу, на баваўнавым камбінаце і швейнай фабрыцы ў Баранавічах.

Працэс укаранення дасягненняў навукі ў вытворчасць зараз трэба ўзняць на новую вышыню, да гэтай справы патрэбен навукова-планавы падыход. Таму ў мінулым годзе шмат зроблена па вывучэнню магчымасцей прымянення праграмна-мэтавага метаду планавання ўкаранення НДР у народную гаспадарку ва ўмовах БДУ. У прыватнасці, распрацавана праграма па даследаванню і ўкараненню электронна-іённай тэхналогіі апрацоўкі харчовых прадуктаў, насення і кармоў.

Нядаўна створанае ў БДУ спецыяльнае канструктарска-тэхналагічнае бюро з вопытнай вытворчасцю сумесна з галіновай лабараторыяй тэрмадынамікі кафедры хімічных працэсаў зрабілі эксперыментальную серыю прыбораў для аўтаматычнага вызначэння тэмпературы ўспышкі нафтапрадуктаў. У народнай гаспадарцы зараз выкарыстоўваецца ўстарэлая прылада ўзору 1942 года. Новая прылада праходзіць выпрабаванне на дзесяці прадпрыемствах рэспублікі і рыхтуецца да серыйнага выпуску.

Рыхтуецца да дзяржаўных прыёмных выпрабаванняў і лічбавы радыёізатопны шчыльпамер, які зараз паспяхова праходзіць праверку ў 22-й Савецкай антарктычнай экспедыцыі.

Аднак у справе скарачэння тэрмінаў укаранення вынікаў закончаных даследаванняў яшчэ шмат цяжкасцей. СКТБ пры універсітэце знаходзіцца яшчэ на стадыі станаўлення і працуе не на ўсю моц. Зробленыя там узоры прылад, канструкцый, макетаў часта не адпавядаюць дзяржаўным стандартам, не вытрымліваюць дзяржаўных прыёмных выпрабаванняў і не ідуць у серыйную вытворчасць.

Паляпшэнне работы СКТБ, стандартызацыя і уніфікацыя ўзораў новых прылад і канструкцый — вось шлях да паскарэння ўкаранення вынікаў навукова-даследчых работ НДА універсітэта ў вытворчасць.

**С. ЯШЧУК,**
**загадчык сектара даведачнай работы, прапаганды і ўкаранення службы навукова-тэхнічнай інфармацыі.**

## ПА БДУ
## ІНФАРМАЦЫЯ

### НА ГІСТФАКУ

**Учора на гістарычным факультэце адбыўся партыйны сход. З дакладам «Аб рабоце партыйнай арганізацыі факультэта па камуністычнаму выхаванню студэнтаў у святле рашэнняў XXV з'езда КПСС і XXVIII з'езда КПБ» выступіла Т. Галко. Сход прыняў адпаведную пастанову.**

### У КАМІТЭЦЕ КАМСАМОЛА БДУ

**Аб стане і мерах па карэннаму паляпшэнню работы факультэта грамадскіх прафесій, аб павышэнні эфектыўнасці работы камсамольскіх арганізацый супрацоўнікаў ішла размова на чарговым пасяджэнні бюро камітэта камсамола БДУ. Сярод іншых пытанняў, разгледжаных на бюро, — гатоўнасць зімовага СБА да выканання вытворчай і грамадска-палітычнай праграмы, правядзенне зорнага паходу ў камсамольскай арганізацыі БДУ.**

### ЗІМОВЫЯ СБА

**Створаныя на факультэце прыкладной матэматыкі і радыёфізічным факультэце зімовыя студэнцкія будаўнічыя атрады, у саставе якіх зараз налічваецца каля паўсотні студэнтаў, у час зімовых канікулаў будуць працаваць на будоўлях Мінска і Маладзечна.**

**Зараз зацверджаны саставы атрадаў, вядзецца падрыхтоўчая работа.**

## З ПРАГАЙ ДА НАВУКІ



СНДЛ — студэнцкая навукова-даследчая лабараторыя. Колькі іх у БДУ? Шмат. У адных вывучаюць фізічныя з'явы, у іншых даследуюць хімічныя рэакцыі, рыхтуюць рознага роду радыё- і тэлеперадачы, вывучаюць прыроду мовы...

Факультэт прыкладной матэматыкі. Я падыходжу да дошкі аб'яў. Колькі запрашэнняў, адно прывабней за другое! Мабыць, у першакурснікаў проста вочы разбягаюцца. Запрашае «Аптыміст», запрашае «Праграміст», запрашае...

І вось я, не ўтрымаўшыся, зазірнула ў адну з лабараторый.

Такім чынам, «Праграміст» — навуковы гурток, першая ступень даследчай работы студэнтаў.

— Чаму вы выбралі менавіта гэты гурток?

— Цікава, — адказаў адзін з прысутных.

— Карысна, — дадаў другі.

Цішыня. Дзелавая абстаноўка, ніякага шуму і шоргання. Уражанне такое, што кожны заняты сваёй справай. Пішуць, з галавой акунуўшыся ў свет лічбаў, галаваломных задач і здзіўляючых адкрыццяў. Цікава, што новыя паведамленні і даклады робіць ля дошкі не выкладчык, а студэнт-першакурснік.

Тон заняткам задае Вячаслаў Мікалаевіч Родзіч, кіраўнік. Тэма сённяшніх заняткаў — «Розныя сістэмы вылічэння». Па дошцы дзелавіта пастуквае крэйда. Голас студэнткі — дакладны, упэўнены, хаця і растлумачвае яна новае, невядомае прысутным. Вячаслаў Нікіфаравіч перапыняе яе, прапаноўваючы студэнтам самім падумаць.

Пасля заняткаў я спытала ў Вячаслава Мікалаевіча, як студэнты рыхтуюць гэтыя даклады. Хто ім дапамагае? Аказваецца, усё, ад пачатку і да канца, гурткоўцы робяць самі: чытаюць, разбіраюцца, працуюць з ЭВМ.

— Ад наведвання гуртка студэнты атрымліваюць вялікую карысць, — гаворыць Вячаслаў Мікалаевіч. — Веды! — вось гэтая карысць. Атрымліваюць іх яны значна больш, чым астатнія студэнты, і некалькі раней.

...Заняткі скончаны. Чарговыя заняткі аднаго са шматлікіх навуковых гурткоў, дзе пачынаецца шлях у вялікую навуку.

**М. МІНАКОВА.**

**ФОТАРЭПАРТАЖ**

## ПАРА ЭКЗАМЕНАЎ — ПАРА АДКАЗНАЯ

Кожны, хто зойдзе ў гэтыя дні ў наш універсітэт, як, дарэчы, і ў любую іншую вышэйшую навучальную ўстанову, адразу заўважыць асаблівую, напружаную атмасферу, якая пануе тут. Узрушаныя твары студэнтаў, што групамі збіраюцца ля дзвярэй аўдыторый — хвалююцца за сяброў. Урачыстыя, нават крыху загадкавыя выкладчыкі...

Ва універсітэце гаспадарыць сесія.

(Заканчэнне на 2-й стар.).





НА ЗДЫМКАХ: экзамен па ма эматыцы прымае дацэнт У. Р. СКАЦЕЦКІ; да адказу рыхтуецца Ірына САЛОНІКАВА.




# НА ПАРОЗЕ СТУДЭНЦТВА

Здаецца, зусім нядаўна пачаліся заняткі на падрыхтоўчым аддзяленні Белдзяржуніверсітэта, але яго слухачы ўжо паспелі прывыкнуць да свайго новага становішча, бліжэй пазнаёміцца з універсітэтам, пасябраваць. Аб сваіх уражаннях пасля першага месяца заняткаў мы папрасілі расказаць прадстаўнікоў групы філолагаў.

**— Чаму вы пайшлі займацца на падрыхтоўчае аддзяленне?**

**К. Мінаева:** Не пашанцавала пры паступленні на дзённае аддзяленне.

**В. Жутко:** Марыла быць журналістам, а трапіла ў філолагі. Параілі паступаць на філалагічны факультэт.

**Н. Канцавая:** Вельмі люблю літаратуру. Пайшла на філфак, каб яшчэ больш ведаць і разумець яе.

**У. Крывіцкі:** Каб лепш падрыхтавацца. Калі працаваў — не было часу для заняткаў.

**— Што вы можаце сказаць аб першым месяцы вучобы, аб сваім калектыве, аб выкладчыках?**

**К. Мінаева:** Наведалі нас былыя слухачы падрыхтоўчага аддзялення, падбадзёрылі. Выкладчыкі аднесліся таксама вельмі ўважліва.

**В. Жутко:** У нас склаўся моцны сяброўскі калектыў.

**Н. Канцавая:** Хоць мы вывучаем толькі школьную праграму, нам усё ж не вельмі лёгка. Мабыць, таму, што займаемся ў нязвыклых абставінах. .

**В. Крывіцкі:** З задавальненнем акунуўся ў атмасферу студэнцкага жыцця, задаволен нашым калектывам, у якога адзіная мэта — вучыцца.

**— З якімі цяжкасцямі давялося сустрэцца?**

**К. Мінаева:** Ніколі раней не займалася прафсаюзнай работай, а тут выбралі старшынёй прафкома падрыхтоўчага аддзялення.

**В. Жутко:** Асаблівых цяжкасцей пакуль няма, праўда, яшчэ не зусім удала размяркоўваю свой вольны час...

**Н. Канцавая:** Нязручна, што побач з інтэрнатам няма сталовай. Не вельмі добрыя у нас і бытавыя ўмовы.

**В. Крывіцкі:** Цяжкасцей для мяне пакуль няма. Галоўнай сваёй задачай лічу паспяховую вучобу.

**— Якімі вы ўяўляеце сябе пасля заканчэння вучобы?**

**К. Мінаева:** Бачу сябе перад школьнай аўдыторыяй.

**В. Жутко:** Цяжка адказаць адразу... Хачу пісаць, але час пакажа.

**Н. Канцавая:** Уяўляю сябе літаратуразнаўцай. І наогул, мастацтва мяне вельмі захапляе, вымушае марыць, лепш разумець жыццё.

**В. Крывіцкі:** Хачу быць філолагам, чалавекам, патрэбным усім.

**М. ДУБОВІК,**
**В. ЧУЧМАН.**

# Мікалай Рыгоравіч КРУЦЬКО



15 студзеня 1977 года пасля цяжкай і працяглай хваробы памёр Мікалай Рыгоравіч **Круцько**, член КПСС з 1944 года, загадчык кафедры навуковага камунізму Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна, доктар філасофскіх навук, прафесар.

М. Р. Круцько нарадзіўся 11 снежня 1919 года ў горадзе Нежыне Чарнігаўскай вобласці. Скончыў Нежынскі педагагічны інстытут. Актыўны ўдзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У пасляваенныя гады працаваў выкладчыкам Вышэйшага ваенна-марскога вучылішча ў г. Калінінградзе, а з 1960 года—у Белдзяржуніверсітэце імя У. І. Леніна. З 1964 года ўзначальваў кафедру навуковага камунізму БДУ.

Мікалай Рыгоравіч Круцько быў высокакваліфікаваным педагогам і навуковым работнікам, унёс значны ўклад у падрыхтоўку кадраў па навуковаму камунізму. Ім апублікавана больш як 60 навуковых работ. Ён з'яўляўся старшынёй спецыялізаванага вучонага савета па філасофіі і навуковаму камунізму пры БДУ імя У. І. Леніна, членам рэдкалегіі часопісаў «Научный коммунизм» і «Вестник БГУ имени В. И. Ленина», вёў вялікую грамадскую работу.

Чалавек вялікай партыйнай прынцыповасці і патрабавальнасці, Мікалай Рыгоравіч заўсёды заставаўся чулым і сціплым таварышам.

Радзіма высока ацаніла ратныя і працоўныя заслугі М. Р. Круцько. Ён узнагароджан ардэнам Чырвонай Зоркі, пяццю медалямі, ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР.

Светлая памяць пра Мікалая Рыгоравіча Круцько назаўсёды захаваецца ў сэрцах тых, хто ведаў яго і працаваў разам з ім.

**Р. П. Платонаў, Я. М. Бабосаў, М. М. Мяшкоў, Т. Ц. Дзмітрыева У. Д. Атрошчанка, І. Р. Дабрародні, Р. С. Мароз, Г. Т. Карноў, П. П. Дронь, Н. В. Фокіна, У. М. Сікорскі, М. С. Гарашчук, А. Я. Малышаў, У. С. Багданаў, П. А. Дубавец, А. Д. Малочка, В. І. Сцяпанаў, Т. І. Прытыцкая, Г. П. Давідзюк, М. І. Базылёў, А. С. Кляўчэня, Л. Ф. Яўменаў, В. К. Драчоў.**

## ФОТАРЭПАРТАЖ

# ПАРА ЭКЗАМЕНАЎ— ПАРА АДКАЗНАЯ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

З нецярплівасцю, як і ўсе першакурснікі, чакала сваю першую сесію студэнтка 5-й групы І курса геафака Ірына Салонікава. Пачатак у яе нядрэнны. Вось ужо другі экзамен здае на «выдатна».

Для другакурснікаў сесія — справа ўжо прывычная. Спакойна, упэўнена адказвае на атрыманыя пытанні па матэматыцы студэнт 1-й групы II курса хімфака Эдуард Астроўскі. Прымае экзамен дацэнт Уладзімір Рыгоравіч Скацецкі.

У суседняй аўдыторыі трэцякурснікі-хімікі здаюць экзамен па квантавай хіміі. Усхвалявана сустракаюць дзяўчаты кожнага толькі што адказаўшага. Цікава, якія былі пытанні, што атрымала сяброўка?



А далей — дзяўчатыдругакурсніцы Ларыса Караткевіч і Вера Скабеева ў апошні раз перагортваюць старонкі падручніка па фізіцы. Зараз ім ісці адказваць. А хто не ведае, што для хімікаў фізіка — экзамен не самы лёгкі.

Зазірнулі мы і на біяфак. Экзамен па «Ніжэйшых раслінах» прымае ў студэнтаў другога курса старшы выкладчык кафедры сістэматыкі раслін Аляксандр Ігнатавіч Сцефановіч. Ён задаволен адказамі.

**НА ЗДЫМКАХ:** «Зазірнём яшчэ ў падручнік...»; старшы выкладчык **А. І. СЦЕФАНОВІЧ** адказам задаволен.

**Д. НІКАЛАЕЎ,**
**М. ФЕДАРЭНКА.**
Фота аўтараў.



# ВЫПРАБАВАННЕ

## АДЗІН ЭКЗАМЕН З ДВУХ ПУНКТАЎ ПОГЛЯДУ

Сесія — гэта самы адказны перыяд для студэнтаў і выкладчыкаў. Гэта час сур'ёзнай і строгай праверкі ведаў, назапашаных за паўгоддзе. Гэта трывогі, хваляванні, нават бяссонныя ночы і, як узнагарода, — выдатная адзнака за працавітасць...

Мы сустрэліся з другакурснікамі механіка-матэматычнага факультэта ў той час, калі яны заканчвалі здачу экзамена па алгебры, і прапанавалі ім адказаць на некалькі пытанняў.

**— Раскажыце, калі ласка, аб сваіх уражаннях ад экзамена! Што выклікала найбольшую цяжкасць у падрыхтоўцы!**

Тамара **Зянюк:**

— Я лічу, што ў час семестра трэба рэгулярна працаваць, чытаць дадатковую літаратуру, паглыблена вывучаць матэрыял. І тады — экзамен здасца лёгкім.

Марына **Пільнік:**

— Добрая адзнака заўсёды дае зарадку на наступны экзамен. Якія пытанні былі цяжкімі? На мой погляд — «Элементарныя дзельнікі распаўшыхся матрыц».

Уладзімір **Мацюшаў:**

— А ўвогуле за высокую адзнаку заўсёды трэба змагацца, змагацца з самім сабой, часам са сваёй лянотай... Выпрацаваць жалезную сілу волі, прывучыць сябе да самастойнай працы...

**— Ці складаны быў гэты экзамен!**

Марына **Пільнік,** Міхаіл **Каляда,** Людміла **Лапунова,** Валянцін **Мацін:**

— Цяжкасць заключалася ў рашэнні задач. На працягу семестра ў нас не было практычных заняткаў. Праўда, нам заўсёды даваліся практыкаванні для самастойнай работы.

Андрэй **Рапінчук:**

— Акрамя таго, для больш паглыбленага вывучэння асноўнага курса па алгебры, азнаямлення з важнейшымі раздзеламі гэтай навукі напружана працавалі ў семестры гурткі па матэматычнаму аналізу і алгебры пад кіраўніцтвам А. Бандарэнкі, І. Камяка, І. Чумакова.

**— Некалькі слоў аб экзаменатары.**

Уладзімір **Мацюшаў:**

— Аляксандр Адамавіч Бандарэнка — чалавек, улюбёны ў сваю прафесію. Гэтая ўлюбёнасць у яго — нейкая асаблівая, з самой глыбіні душы...

Андрэй **Рапінчук,** Наташа **Дзямешчык:**

— Дакладнасць, яснасць пры выкладанні прадмета, добразычлівасць, чуласць — гэтыя якасці характарызуюць Аляксандра Адамавіча як чалавека і педагога. На яго лекцыях немагчыма не працаваць. Нейкая нябачная ніць трывала звязвае яго з аўдыторыяй. Пры выкладанні складанага матэрыялу ён не лічыцца з асабістым часам, часта сустракаецца са студэнтамі пасля лекцый.

Ларыса **Піскус:**

— На экзамене Аляксандр Адамавіч ацэньвае веды вельмі аб'ектыўна. Адразу пазнае, «вызубрыў» студэнт матэрыял ці расказвае з разуменнем...

***

Але вось экзамен скончыўся. Апусцела аўдыторыя. Выкладчык складвае экзаменацыйныя білеты.

**— Аляксандр Адамавіч, як Вы ацэньваеце групу, адказы студэнтаў на сённяшнім экзамене!**

— У працэсе вучобы рабяты выкладваюцца поўнасцю. Многія сённяшнія «пяцёркі» здабыты стараннасцю, дбайнасцю. Напрыклад, Тамары Зянюк уседлівасць і самападрыхтоўка дапамаглі атрымаць на экзамене адзнаку «добра» А яшчэ — сяброўская дапамога Уладзіміра Мацюшава, Андрэя Рапінчука. Між іншым, на Андрэя Рапінчука выкладчыкі ўскладаюць вялікія надзеі. Ва універсітэт ён паступіў пасля заканчэння 8 класаў. Зараз Андрэю 16 год. Матэрыял на лекцыях ён «схоплівае» на ляту.

**— Ну, а як Вы лічыце, што выклікае найбольшую цяжкасць у падрыхтоўцы да экзаменаў!**

— Рашэнне задач на доказ. Задачы і прыклады «стандартныя», гэта значыць на вылічэнне, у меншай ступені патрабуюць ад студэнтаў самастойнага мыслення. Калі канкрэтна, то найбольшую складанасць выклікаў матэрыял па тэмах «Групы, колы, палі» і «Абагульненая Жаданавая форма».

**— Аляксандр Адамавіч, што Вы можаце сказаць пра гурток па алгебры, які арганізаван на Вашай кафедры!**

— Асноўная задача гуртка— больш паглыбленае вывучэнне асноўнага курса алгебры. Са студэнтамі другога курса мы рашалі спецыяльныя задачы, звязаныя з важнейшымі раздзеламі алгебры. Найбольш актыўны ўдзел у працы гуртка прымаюць студэнты Л. Капытkоўскі, Е. Карабко, А. Рапінчук, А. Трале, С. Шчін.

**А. ЯКУБОЎСКАЯ,**
**Л. ЖЫЛІНСКАЯ.**

# ЯКІЯ МЫ?




Выхаваны чалавек... Калі аб вас скажуць такое, лічыце, што ўдастоіліся высокай пахвалы. У жыцці мы не так ужо часта аб кімсьці настолькі пахвальна адзываемся.

Лічылася, што той, хто атрымаў дыплом, ужо сам па сабе чалавек культурны і выхаваны. Жыццё паказвае, што адукаванасць яшчэ не прадвызначае выхаванасць.

Спрадвеку выпрацаваны формы, у якіх людзі выказваюць адзін да аднаго павагу, прыхільнасць. Гэта добра, калі чалавек можа быць стрыманым, праяўляць чуласць, паважаць думкі і жаданні другіх, падтрымліваць сваю годнасць, не прычыняючы пры гэтым крыўды іншаму... А калі не?

Гавораць, што выхаваны чалавек—гэта чалавек «без локцяў». Ну, што датычыцца локцяў— яны ёсць у кожнага. І з імі, трэба сказаць, справа прасцей.

Але вось у мяне ёсць адзін знаёмы. Ён вельмі добры чалавек. Славіцца сваёй уважлівасцю і крыху цырымоннасцю. Нядаўна сустракае мяне і, спагадліва моршчачы лоб, гаворыць:

— Нешта ты вельмі дрэнна выглядаеш — глядзець непрыемна.

Я мармычу нейкія недарэчныя апраўданні аб курсавой, канспектах, семінарах...

Выхаванасць гэта ці не? Чалавек жа, здаецца, праявіў увагу да вас.

Адсутнасць элементарнага такту, прыкрытая ілжывай павагай, характарызуе нявыхаванага чалавека.

Як тут быць? Ну, калі няма ніякай магчымасці змаўчаць, заўважце як бы мімаходзь:

— Нешта ў цябе выгляд стомлены. Шмат працавала, мабыць, на ноч гледзячы? — І сяброўка, не пакрыўдзіўшыся, магчыма, проста адкажа:

— Так, мне нездаровіцца.

Ідзе лекцыя. Выкладчык з захапленнем гаворыць аб мастацтве. І раптам у цішыню дысанансам урываецца барскі-лянівы басок з пазяханнем:

— А ўжо званок...

На паўслове спатыкнуўся чалавек, які толькі што гаварыў прыгожа і захоплена...

Або лекцыі, на якіх некаторыя асобы дэманструюць сваю эрудыцыю. Задаючы часам з дзесятак пытанняў, якія зусім не датычацца да справы, і таму — недарэчныя, яны бравіруюць сваім веданнем і... нявыхаванасцю. Дробязь? — Канешне.

Бо не прывесіш такому эрудыту (часта зусім нядрэннаму студэнту) ярлык «нявыхаваны». Пакрыўдзіцца яшчэ. У амбіцыю ўдарыцца.— Я, маўляў, права маю пагаварыць з выкладчыкам па пытаннях, якія мяне цікавяць! — Маеш, галубчык, маеш.— Ярлык я ўсё ж такі б прывесіла.

Лічаць, што фундамент сённяшняй выхаванасці закладваўся ўжо ў пачатку мінулага стагоддзя, у асяроддзі адукаванага рускага грамадства. Успомнім хаця б герояў «Вайны і міру». Іх уменню быць свабоднымі без развязнасці, пачцівымі без угодлівасці — не грэх бы і павучыцца. Як часта не хапае іменна гэтага сучаснаму студэнту, студэнтцы. А гэта ж рысы інтэлігентнага чалавека.

Аб тым, тоесныя ці не паняцці «інтэлігентнасць» і «выхаванасць», гаварылася дастаткова многа. Але часта з інтэлігентнасцю суадносяць толькі знешні глянец, толькі адукаванасць. І тады ў заняпадзе паняцце «выхаванасць».

Хамства (нявыхаванасці) у нашым асяроддзі яшчэ нямала. Дык давайце будзем гаварыць аб хамстве, падняўшы забрала ілжывай рысоўкі (знайшлі, маўляў, праблему!). Давайце будзем называць рэчы сваімі назвамі.

**І. КРУЧ.**

## АД А ДА Я — ЭТЫКЕТ

### А

**АКУРАТНАСЦЬ** — абавязковая якасць выхаваных людзей. Акуратнасць у адзенні — усё прыгнана, вычышчана, выпрасавана. У штодзённым жыцці — усё ўбрана, вымыта, расстаўлена па месцах. У рабоце — усё ў тэрмін і дакладна. Але... «што залішне — тое нездарова». Ці не акуратнасць, узведзеная ў культ, нараджае замест ахайнасці прылізанасць і замест звычкі да парадку — педантызм?

**АНЕКДОТ** — калі верыць слоўнікам, бяскрыўдная рэч: «Невялікае, забаўнае, смешнае апавяданне». Але калі прыслухацца да размоў не ў меру развесяліўшайся кампаніі, то аказваецца: анекдот — часта брудная, непрыстойная гісторыя, дзе пошласць і пахабшчына змешваюцца ў розных прапорцыях. Не, нездарма гавораць французы: «Анекдоты — гэта дасціпнасць тых, у каго яе няма».

### Б

**БЕСЦЫРЫМОННАСЦЬ** — літаральна «абыходжанне без цырымоній». На першы погляд нават добра: адкрытасць, праматa, натуральнасць. Праверым на ўсякі выпадак. Цырымонія па латыні — глыбокая павага, пашана. Ці не праўда, гэта некалькі мяняе справу. Так што бліжэйшыя сваякі бесцырымоннасці — недалікатнасць, развязнасць, эгаізм.

Стараючыся скрыць сваё паходжанне, бесцырымоннасць часта выступае пад жыццёвым псеўданімам — прастата: «Мы, маўляў, людзі простыя, скажу я табе па-нашаму, па-простаму...» Будзьце асцярожны: гэта якраз тая самая прастата, якая, па трапнаму народнаму выказванню, горш за зладзейства.

# ШТО ЗНАЧЫЦЬ — СТРЫМАНЫ ЧАЛАВЕК?

Калі гавораць аб эмоцыях, маюць на ўвазе перажыванні чалавека, яго хваляванні, радасць, гора, пачуцці захаплення і гневу, любві і нянавісці.

Суб'ектыўны характар эмоцый у многім залежыць ад тыпу нервовай дзейнасці чалавека, яго тэмпераменту, культуры, звычак і стану нервовай сістэмы. Аднак кожны павінен дасканала валодаць здольнасцю стрымліваць сябе. Эмоцыі паддаюцца і выхаванню, і трэніроўцы.

Стан працяглага напружання неспрыяльна адбіваецца на здароўі чалавека, выклікае ў яго адмоўныя эмоцыі, агрэсіўныя рэакцыі. Выхад з сітуацыі заключаецца ў гашэнні нежаданых дзеянняў. Для зняцця эмацыянальнай напружанасці можна выкарыстоўваць шэраг прыёмаў. Вось некаторыя з іх.

1. Вызначце прычыну вашай эмацыянальнай напружанасці.
2. Разгледзьце магчымыя станоўчыя бакі канфліктнай сітуацыі.
3. Успомніце як мага больш інтэнсіўных станоўчых сітуацый, у якіх вы калі-небудзь знаходзіліся.
4. Пераключыцеся на іншую работу або займіцеся любімай справай.
5. Паслухайце добрую, вясёлую музыку, запісаныя на плёнку гумарыстычныя творы.
6. Калі дазваляюць абставіны, пагледзіце камедыйны або прыгодніцкі фільм.
7. Удыхніце прыемныя духі, прыміце цёплую ванну.
8. Адзеньце акуляры сонечнага або ружовага колеру, праз якія навакольнае бачыцца ў іншых танах.
9. Паспрабуйце шырока ўсміхнуцца, «расцягнуўшы рот да вушэй».
10. Успомніце, што чым вы больш зласлівыя, тым менш прывабныя (адмоўныя эмоцыі ствараюць агідны мімічны «фон» на вашым твары»).
11. Завяршыце шэраг незакончаных мерапрыемстваў (адначасовае набліжэнне да шматлікіх мэт выклікае і больш інтэнсіўныя эмацыянальныя адчуванні).
12. Зрабіце фіззарадку або якую-небудзь фізічную работу, якая патрабуе мускульнага намагання (такім чынам часткова «гасяцца» агрэсіўныя рэфлексы).
13. Расслабцеся як мага больш, «пагасіўшы» свае негатыўныя рэакцыі на выкананне расслаблення.
14. Уявіце сабе, што ўзбуджанасць, выкліканая стрэсам, вам неабходна, інакш бы ўсё жыццё прайшло ў спячцы.
15. Звярніце ўвагу на шэраг навакольных станоўчых фактараў (яны рэфлектарна выклікаюць адпаведныя эмоцыі).
16. Ажыццявіце ў думках якія-небудзь «карцінныя» прыемныя дзеянні.
17. Успомніце ўсе закончаныя сёння або ў бліжэйшыя дні справы (яны з'яўляюцца для вас станоўчымі арыенцірамі і выклікаюць адпаведныя эмацыянальныя адчуванні).
18. Выканайце абароннае дзеянне мысленна, уявіце, напрыклад, што вы ўзялі які-небудзь вялізны камень, з намаганнем узнімаеце яго на гару і адтуль кідаеце яго, вызваляючыся ад сваіх непрыемнасцей (гэтае знешне не вельмі лагічнае дзеянне можа выклікаць моцную эмоцыю).
19. Выконваючы якое-небудзь дзеянне, думайце аб яго станоўчым канцы; мяркуючы загадзя аб няўдачы, вы заўсёды асуджаеце сябе на адмоўныя эмоцыі (чалавек, які ідзе па канату з думкай аб тым, што ён упадзе—абавязкова ўпадзе).

**В. КУЛІКОЎ,**
урач.



— А цяпер, сіньёра Мона Ліза, яшчэ адзін анекдот з жыцця свецкіх жанчын...



— Ваша каралеўская вялікасць, я даўно падазраваў, што ўсе гэтыя пошукі Філасофскага каменя закончацца вынаходніцтвам звычайнага самагону...

(З цыкла «Той далёкі век»). Малюнкі Н. ДОРАШ.

## ЛІТАРАТУРА, ПАСТУПІЎШАЯ Ў КАБІНЕТ САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНЫХ І ГІСТАРЫЧНЫХ НАВУК БДУ:




1. ЛЕНІН У. І. Сацыялізм і рэлігія. — Аб адносінах працоўнай партыі да рэлігіі. М., Палітвыдавецтва, 1976.
2. ЛЕНІН У. І. Красавіцкія тэзісы. М., Палітвыдавецтва, 1976.
3. АНДРОПАЎ Ю. В. Ленінізм —навука і майстэрства рэвалюцыйнай творчасці. Даклад на ўрачыстым пасяджэнні ў Маскве, прысвечаным 106-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна. М., Палітвыдавецтва, 1976.
4. КІРЫЛАЎ В. С. Бальшавікі на чале масавых палітычных стачак у першай рускай рэвалюцыі (1905—1907). М., Палітвыдавецтва, 1976.
5. ЛАПІН Н. І. Малады Маркс. Выд. 2-е, перапрац. і дапоўненае. М., Палітвыдавецтва, 1976.
6. Дзеячы міжнароднага працоўнага руху аб рэлігіі і царкве. (Заходняя Еўропа. Канец XIX — пачатак XX ст.). М., «Мысль». 1976.
7. ГРЗАЛ Я., ПАПОЎ С. Крытыка сучасных буржуазных сацыялістычных тэорый. М., «Прогресс». 1976.
8. ЧАГІН Б. А., КЛУШЫН В. І. Барацьба за гістарычны матэрыялізм у СССР у 20-я гады. Л., «Наука», 1975.
9. БАГДАНАЎ У. С. Партыйныя арганізацыі Беларусі ў барацьбе за ўмацаванне дысцыпліны працы ў прамысловасці. Мінск, выд. БДУ імя У. І. Леніна, 1976.
10. Міжнародны камуністычны і рабочы рух. Гісторыя і сучаснасць. Вып. І. Л., Выд. ЛГУ, 1976.
11. МУТОЎКІН Н. С. Першая канферэнцыя РСДРП. М., «Высшая школа», 1976.
12. КУЗЬМІН В. П. Прынцыпы сістэмнасці ў тэорыі і метадалогіі К. Маркса. М., Палітвыдавецтва, 1976.
13. РАЗЕНТАЛЬ М. М. Дыялектыка ленінскага даследавання імперыялізму і рэвалюцыі. М., «Мысль», 1976.
14. КУПЦОЎ В. І. Дэтэрмінізм і верагоднасць. М., Палітвыдавецтва, 1976.
15. ШЫРОКАЎ В. Г. XI з'езд РКП(б). М., «Высшая школа», 1976.
16. БЫЧКО І. В. У лабірынтах свабоды. М., Палітвыдавецтва, 1976.
17. ГРЫГУЛЕВІЧ І. Р. Інквізіцыя. Выд. 2-е, выпр., Палітвыдавецтва, 1976.
18. ВОЛКАЎ Т. Н. Вытокі і гарызонты прагрэсу. М., Палітвыдавецтва, 1976.
19. ЗАРЭЦКАЯ С. І. Знешняя палітыка Кітая ў 1856—1860 гадах: адносіны з Англіяй і Францыяй. М., «Наука», 1976.
20. БУГАНАЎ В. І. Сялянская вайна ў Расіі пачатку XVII стагоддзя. М., «Просвещение», 1976.

# У МУЗЕІ ПЕСНЯРА

НЯДАЎНА СЛУХАЧЫ ГРУПЫ ЖУРНАЛІСТАЎ ПАДРЫХТОЎЧАГА АДДЗЯЛЕННЯ БДУ НАВЕДАЛІ МУЗЕЙ НАРОДНАГА ПЕСНЯРА БЕЛАРУСІ ЯНКІ КУПАЛЫ, ДЗЕ БЛІЖЭЙ ПАЗНАЁМІЛІСЯ З ЖЫЦЦЁВЫМ ШЛЯХАМ ПАЭТА, З ЯГО ТВОРЧАСЦЮ.

З увагай і цікавасцю разглядалі мы ўласныя рэчы паэта; саху, цэп і іншыя сялянскія працоўныя прылады, якімі карыстаўся ў свой час Янка Купала. Усё гэта абуджала думкі аб гаротнай долі беларускага народа ў дакастрычніцкі час, што яскрава паказаў у сваіх вершах паэт.

Надоўга застанецца ў памяці ўражанне аб гэтай экскурсіі.

**Л. ПАЎЛАЗА,**
**А. ВЕРАСОК.**

В. а. рэдактара В. А. ВОЛЬСКІ.

НАШ АДРАС Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.